**М. Альховік**
*Беларускі дзяржа ўны універсітэт*

# ІНСТЫТУТ ФІЛАСОФІІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР У 1930-Я ГГ.

Развіццё беларускай філасофіі ў 1930-я гг. мела пэўную адметнасць. Свабоднае развіццё філасофскай думкі фактычна адсутнічала. Філосафы прэзентавалі менавіта той пункт гледжання, які ім навязваўся звыш.

Нацыянальныя кадры філосафаў былі засяроджаны вакол інстытута філасофіі Беларускай акадэміі навук [1, с. 59]. Ён быў утвораны ў 1931 г. у г. Менску на базе кафедры марксізму-ленінізму і ўваходзіў у аддзяленне грамадскіх навук. З 1931 г. па 1938 г. дырэктарам інстытута з’яўляўся Сямён Якаўлевіч Вальфсон (1894–1941). Па нацыянальнасці большасць аспірантаў і навукоўцаў інстытута былі беларусамі і яўрэямі. Так, у 1932 г. аспірантуру інстытута філасофіі закончылі 2 яўрэі і 1 беларус,у 1933 г. – 7 беларусаў і 2 яўрэі. У 1933/1934 н. г. на III курсе вучыліся 2 беларусы, на II – 4 беларусы і 1 яўрэй, на I – 2 беларусы, 2 яўрэі, 1 рускі [2, с. 68].

Уласна філасофскі складнік займаў мала месца ў дзейнасці інстытута. Так, супрацоўнікі інстытута выдавалі падручнікі па дыялектычным матэрыялізме (Б. Быхоўскі, А. А. Гольдштэйн і інш.), пісалі артыкулы і кнігі – аб філасофскіх поглядах К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, Г. В. Пляханава, Розы Люксембург, І. В. Гётэ, Г. Гейнэ, В. Н. Бялінскага, аб рэлігійных арганізацыях Койданаўскага (Дзяржынскага) раёна і г. д. Але ў цэлым з 1931 г. у цэнтры ўвагі знаходзіліся пытанні марксізму-ленінізму, у т. л. і тыя, якія не мелі ніякага дачынення да філасофіі. Вельмі адмоўна адбівалася палітычная кан'юнктура: філосафы былі змушаны мяняць свае погляды ў адносінах да грамадска-палітычных з'яў, многія філасофскія творы так і не былі надрукаваны. Работнікі Інстытута былі асноўнымі і пастаяннымі дакладчыкамі-прапагандыстамі па пытаннях філасофіі марксізму-ленінізму на фабрыках і заводах Беларусі, на зборах раённага актыву, у часцях Чырвонай арміі, у ВНУ і г. д., публікавалі юбілейныя артыкулы ў перыядычным друку.

У публікацыях многіх філосафаў аб культурнай спадчыне атрымаў шырокі распаўсюд погляд на мінулую беларускую культуру як на “рэакцыйна-феадальную” (IX-XVIII стст.) ці на “буржуазна-нацыяналістычную” (XIX ст. – пач. 1930-х гг.). У 1930 г. С. Вальфсон і Р. Выдра склалі зборнік “Навука на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі”, маніфестуючы, што яны выкарысталі марксісцка-ленінскі падыход да асвятлення нацыянальнага пытання. Яны бачылі “контррэвалюцыю” ў зборы фальклору (напрыклад, казак пра асілкаў, волатаў), у выкарыстанні нацыянальнага пейзажу, арнаменту, у прызнаннях любові да Бацькаўшчыны, у правядзенні этнаграфічных экспедыцый у глыбінцы, у шырока распаўсюджаным краязнаўчым руху, у пошуку самабытных беларускіх слоў, у доказе адметнасці нацыянальнай гісторыі, у збіранні музейных

калекцый і г. д. Спачатку Савецкая ўлада станоўча ўспрыняла выхад зборніка як накіраванага супраць яе палітычных супернікаў – супраць беларускіх нацыяналістаў (гэтым творам было распачата бесперапынная крытыка беларускага нацыяналізму філасафамі, гісторыкамі і партыйнымі прапагандыстамі). Пасля таго, як Сталін часова абвясціў рускі вялікадзяржаўны шавінізм галоўнай палітычнай небяспекай для дзейнай улады, С. Вальфсона і Р. Выдру абвінавацілі ва ўхіле ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, у ігнараванні і насмешках з нацыянальных асаблівасцяў беларускай пралетарскай культуры і быту, у нігілізме у дачыненні да культурнай спадчыны і г. д.

Праблемы "нацыянальнай формы і сацыялістычнага зместу пралетарскай культуры" на прыкладзе нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Беларусі, станаўлення і развіцця нацыянальнай адукацыі, беларускай сацыялістычнай культуры былі асветленыя ў кнізе С. Я. Вальфсона "Культурная рэвалюцыя ў дзеяньні. Нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі" (1932), у артыкуле Р.Выдры ў часопісе "Бальшавік Беларусі" (№1–2 за 1935 г.) "Перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі". Пытанні тэорыі і практыкі пралетарскага інтэрнацыяналізму на досведзе нацыянальнага будаўнітва ў СССР, у т. л. у Савецкай Беларусі былі раскрытыя ў творы С. Вальфсона і І. Ільюшына «Аб пралетарскім інтэрнацыяналізме ў нацыянальна-каланіяльным пытанні» (1935). Пагаршэнне адносін СССР з Польшчай і Германіяй пасля 1934 г. паспрыяла ўключэнню ў філасофскі дыскурс пытанняў германскага расізму і польскага нацыяналізму.

Шматлікія працы, аднак, не пабачылі свету – напр., "Нацыянальныя асаблівасці калгаснага будаўніцтва ў БССР", "барацьба КП(б)Б на два фронты ў нацыянальным пытанні" (1933 г.) [3, с. 86]. У 1936 г. філасофы паспрабавалі абараніць кіраўнічую партыю ад абвінавачвання ў знішчэнні беларускай нацыянальнай культуры, русіфікацыі нацыянальных меншасцяў і беларусаў са слабой нацыянальнай самасвядомасцю і г. д.: на 1936 г. Інстытут філасофіі намячаў распрацоўку пытання ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ў сацыялістычным будаўніцтве БССР (да 20-годдзя Кастрычніка). Аднак праца так і не была надрукавана.

У 1935 г. інстытут філасофіі быў аб'яднаны з Інстытутам савецкага будаўніцтва і права ў Інстытут філасофіі і права (скасаваны ў 1938 г. у сувязі з тым, што абсалютная большасць яго супрацоўнікаў была знішчана падчас палітычных рэпрэсій). Дзейнасць інстытута філасофіі была адноўлена ў 1948 г.

---

1. *Альховік М. К.* Беларуская нацыянальная ідэя // Человек. Культура. Общество. Минск: БГУ, 2012.

2. НАРБ, фонд 4п, вопіс 1, справа 6713

3. *Шпілеўскі, І. Ф.* Беларуская Акадэмія навук да XV-годдзя БССР / І. Ф. Шпілеўскі. – Менск: Выд-ва БАН, 1934.